*2.* Большой энциклопедический словарь / гл. ред. А. М. Прохоров. – 2-е изд., перераб. и доп. – М. : Большая рос. энцикл. ; СПб. : Норинт, 2004. – 1434 с.

*3. Пави, П.* Словарь театра / П. Пави ; пер. с фр. под ред. К. Разлогова. – М. : Прогресс, 1991 – 480 с.

*4.* Театральная энциклопедия : в 5 т. / гл. ред. С. С. Мокульский. – М. : Совет. энцикл., 1961–1967. – 5 т.

*5. Ушаков, Д. Н.* Большой толковый словарь современного русского языка : 180 000 слов и словосочетаний / Д. Н. Ушаков. – М. : Альта-Принт, 2005. – 1239 с.

# МАГЧЫМАСЦІ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫХ МУЗЕЯЎ У ГРАМАДСКА-ПАТРЫЯТЫЧНЫМ ВЫХАВАННІ СРОДКАМІ МУЗЕЙНАЙ ПЕДАГОГІКІ (на прыкладзе дзейнасці Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа)

***В. Ю. Себруковіч,***
*магістр культуралогіі, загадчык аддзела навуковай прапаганды Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа*

Сацыяльна-палітычныя рэаліі апошняга часу сведчаць, што эканамічная дэзінтэграцыя, сацыяльная дыферэнцыяцыя грамадства, дэвальвацыя духоўных каштоўнасцей зрабілі даволі негатыўны ўплыў на грамадскую свядомасць большасці сацыяльных і ўзроставых груп насельніцтва краіны [1, с. 13]. Абыякавыя адносіны да культурнай спадчыны, незацікаўленасць гісторыяй сваёй Радзімы, яе мовай і традыцыямі – усё гэта няспынна вядзе да згублення культурай сваёй вызначальнай ролі ў грамадстве, а таксама да адсутнасці пачуцця патрыятызму.

Музеі Беларусі валодаюць вялікім і невычарпальным патэнцыялам на шляху прыпынення гэтага дэструктыўнага працэсу, а таксама ў справе захавання, даследавання і вывучэння культурна-гістарычнай спадчыны, што з’яўляецца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

неад'емным накірункам грамадзянска-патрыятычнага выхавання.

Агульнапрынятае вызначэнне паняцця «патрыятызм» трактуецца як любоў да Радзімы, што, у сваю чаргу, вылучаецца некалькімі складаючымі: веданне гісторыі свайго краю; павага да роднай мовы, звычаяў і традыцый; імкненне захаваць гісторыка-культурную спадчыну сваёй краіны. Наяўнасць і разуменне ў грамадстве ўсіх вышэй пералічаных складаючых, спрыяе фарміраванню патрыятычна выхаванай асобы.

У артыкуле будзе дадзена спроба ахарактарызаваць і вылучыць асаблівасці працы музея літаратурна-мемарыяльнага профілю па патрыятычным выхаванні на прыкладзе дзейнасці Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа.

Статус адзінага мемарыяльнага музея-сядзібы ў Мінску вызначае яго ўнікальнасць сярод іншых літаратурных музеяў сталіцы.

Музеі дадзенай тыпалагічнай групы ў сваіх відах дзейнасці кіруюцца перш за ўсё паняццем мемарыяльнасці, неабходным кампанентам якой лічыцца сапраўднасць месца: мемарыяльны будынак, дзе захавана ці ўзноўлена на дакументальнай аснове мемарыяльнае становішча, у якім жыў чалавек ці адбывалася падзея [2, с. 341]. Прычым статус мемарыяльнага музея, на нашу думку, толькі спрыяе ва ўспрыняцці інфармацыі наведвальнікамі, асабліва дзецьмі і падлеткамі. Мемарыяльныя прадметы разам з аўтэнтычным асяроддзем, у якім яны знаходзяцца, узмацняюць, абвастраюць успрыняцце інфармацыі, моцна ўздзейнічаюць на эмацыйную сферу дзіцяці, бо ўсё гэта захоўвае вялікі духоўны патэнцыял.

У сувязі з гэтым магчымасці музеяў літаратурна-мемарыяльнага профілю ў фарміраванні патрыятычна выхаванай, гарманічна развітай асобы неацэнныя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа сёння – гэта своеасаблівы нацыянальны культурны цэнтр па вывучэнні, даследаванні і папулярызацыі творчай спадчыны народнага паэта Беларусі Якуба Коласа, які несумненна з'яўляецца брэндам беларускай культуры.

Культурна-адукацыйная дзейнасць музея перш за ўсё скіравана на патрэбы сучаснага наведвальніка. Так, для рэалізацыі патрыятычнага выхавання акрамя традыцыйных форм работы з наведвальнікам (экскурсіі, лекцыі, лекцыі-дэманстрацыі, музейна-педагагічныя заняткі і інш.) перспектыўным бачыцца рэалізацыя інавацыйных менавіта комплексных музейных праектаў, якія ўлічвалі б патрэбы сучасных школьнікаў ці студэнтаў як асноўнай мэтавай аўдыторыі Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа.

Гэтая акалічнасць вынікае з перакання ў тым, што выхаванне музейнай культуры фарміруецца ў маленстве, «зерне» любові і павагі да сваёй Радзімы, традыцый і мовы закладаецца ў прыдатную «глебу» ад самага пачатку фарміравання маленькага чалавека як асобы.

Асноўны акцэнт патрыятычнага накірунку ў працы з маленькімі наведвальнікамі робіцца не толькі на далучэнне дзяцей і моладзі да свету беларускай культуры, на шанаванне нацыянальных традыцый. Разуменню роднай беларускай мовы як «духоўнага скарбу нацыі, яе неацэннай спадчыны, якую нашчадкі мусяць зберагаць і захоўваць, перадаючы новым пакаленням» [3, с. 107], надаецца вялікае значэнне. У сувязі з гэтым варта адзначыць музейныя праекты, якія сталі традыцыйнымі, выклікаюць зацікаўленасць і атрымалі станоўчыя водгукі ў маленькіх і вялікіх гасцей Дома Коласа.

Набыла папулярнасць штогадовая музейная акцыя «Дзясятка – за Коласа!», прымеркаваная да Міжнароднага дня роднай мовы. Удзельнікі музейнай акцыі павінны былі напісаць дыктоўку па творах Якуба Коласа і вызначыць, з якога твора ўзяты ўрывак для дыктоўкі. Таксама кожны з удзель-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нікаў атрымаў магчымасць праверыць свае веды па жыцці і творчасці Якуба Коласа, беларускай мове, літаратуры ў інтарактыўнай гульні-віктарыне «Куфэрак скарбаў роднай мовы». Удзельнікі, якія напісалі дыктоўку на дзесяць балаў і правільна назвалі твор Якуба Коласа, атрымалі падзякі і памятныя сувеніры ад музея. Акрамя гэтага, усе ахвочыя, хто па розных прычынах не змаглі ў гэты дзень прыйсці ў музей, атрымалі магчымасць паўдзельнічаць у інстаграм-акцыі «Маё любімае слова на роднай мове». Самыя арыгінальныя адказы былі адзначаны, актыўныя ўдзельнікі былі ўзнагароджаны прызамі. На нашу думку, такія акцыі не толькі далучаюць сучасных дзяцей і моладзь да справы захавання моўных традыцый, але з’яўляюцца магутным стымулам да ўзбуджэння цікавасці да беларускай літаратуры, культуры і, у прыватнасці, да наведвання музея.

Комплексным праектам, які стаў доўгатэрміновым і ажыццяўляецца ўжо каторы год з вялікім поспехам, стаў праект «Крочым у школу разам з Коласам», які арыентаваны на дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. Праект мае на мэце дапамагчы падрастаючаму пакаленню ў адукацыі, духоўным і інтэлектуальным развіцці, садзейнічаць сацыялізацыі і жыццёваму самавызначэнню ў працэсе разнастайнай творчай дзейнасці, заснаванай на зносінах, вывучэнні літаратуры, гісторыі і культурных каштоўнасцей, роднай мовы. Безумоўна, усе музейныя заняткі ў рамках праекта адбываюцца на беларускай мове. Маленькія наведвальнікі не толькі чуюць родную мову, але і самі вучацца чытаць і пісаць па-беларуску. Так, на занятку «Творчая майстэрня. Вырабы з цеста» ў наведвальнікаў ёсць унікальная магчымасць не толькі прачытаць урывак з верша Якуба Коласа «Савосьраспуснік», але і запісаць сваё аўтарскае прачытанне на дыск з дапамогай мультымедыйнага комплекса. На заключнай сустрэчы кожны можа напісаць пажаданне на навучальны год сапраўдным пяром Якуба Коласа.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сярод школьнікаў карыстаюцца папулярнасцю квэсты (квэст-гульня «Таямніцы Дома песняра», «Мінскія адрасы Якуба Коласа», віктарыны па жыцці і творчасці Якуба Коласа. Напрыклад, інтэрактыўная гульня «Едзем па свеце з дзядзькам Якубам» праходзіць у выглядзе займальнага віртуальнага падарожжа ў тыя мясціны, дзе бываў некалі сам Якуб Колас. З дапамогай мультымедыйнай прэзентацыі вучні даведваюцца пра асноўныя этапы жыцця і творчасці песняра. Такія інавацыйныя формы работы не толькі актуальныя ў сучасных умовах, яны карысныя тым, што спрыяюць больш поўнаму раскрыццю адукацыйнага, духоўнага, камунікатыўнага патэнцыялу семантычнай прасторы мемарыяльнага музея.

Як вядома, мемарыяльныя музеі ў сваёй дзейнасці абмежаваны недахопам выставачных плошчаў, адсутнасцю асобных памяшканняў для правядзення музейных заняткаў, майстар-класаў. Аднак у Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа гэта праблема часткова кампенсуецца за кошт наяўнасці тэрыторыі вакол самага музея, дзе маецца асобная дзіцячая пляцоўка пад назвай «Паэтычны куток». У спрыяльнае надвор’е там праводзяцца музейныя заняткі, прэзентацыі мастацкага чытання, майстар-класы па вырабе традыцыйнай лялькі-абярэга, саламяных птушак; ладзяцца традыцыйныя народныя гульні, літаратурна-фальклорныя святы, напрыклад свята «Гуканне вясны».

У альтанцы, якая знаходзіцца на пляцоўцы, для школьнікаў пачатковых класаў праводзяцца тэатралізаваныя прадстаўленні паводле твораў Якуба Коласа для дзяцей і беларускіх народных казак.

Падчас школьных канікул музей таксама арганізоўвае цікавыя адукацыйна-забаўляльныя мерапрыемствы ў межах праекта «Канікулы ў Доме Коласа». Сярод іх асабліва запатрабавальным з’яўляецца праект «Калядная ялінка ў Доме Коласа», у складзе якога праходзяць лекцыі па гісторыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўзнікнення елачных цацак і аб традыцыях святкавання Калядных святаў на Беларусі, майстар-класы па стварэнню навагодняй паштоўкі і выцінанкі, а таксама дзіцячы ранішнік «Калядныя прыгоды ў Доме Коласа». Дзеці на такія мерапрыемствы прыходзяць у музей разам з бацькамі, дзе не толькі цікава і пазнавальна праводзяць вольны час як наведвальнікі, але і становяцца паўнавартаснымі ўдзельнікамі дзейства, неверагодных падзей, якія адбываюцца ў музеі.

З мэтай выяўлення, падтрымкі і заахвочвання таленавітых дзяцей у музеі ўжо каторы год праводзяцца конкурсы творчых работ для школьнікаў, прымеркаваныя да юбілейных дат музея, твораў Якуба Коласа, значных падзей у яго жыцці. Так, у мінулым 2018 г. конкурс «У словах-вобразах, у песнях вольнаплынных…» быў прымеркаваны да 100-годдзя першага выдання паэмы Якуба Коласа «Сымон-музыка» і 95-годдзя паэмы «Новая зямля». Парадавала тое, што конкурс выклікаў вялікую зацікаўленасць у настаўнікаў і вучняў з усіх куткоў Беларусі. На адрас музея прыйшло каля дзвюх тысяч работ.

На малой радзіме песняра ў Стаўбцоўскім раёне Мінскай вобласці прымае наведвальнікаў філіял «Мікалаеўшчына», які аб'ядноўвае мемарыяльныя сядзібы Акінчыцы, Ласток, Альбуць і Смольню. На мемарыяльных сядзібах, якія сталі месцам жыхарства сям'і Міцкевічаў, таксама адбываецца шмат мерапрыемстваў, а навакольная прырода і асяроддзе гэтаму садзейнічаюць. Так, падарожжа па філіяле можна здзейсніць падчас пешага экскурсійнага маршруту Акінчыцы – Альбуць – Смольня. У гаспадарчай пабудове на тэрыторыі сядзібы Альбуць размешчаны інтэрактыўныя зоны. «У хатцы бабкі-знахаркі» можна пазнаёміцца з раслінным светам Стаўбцоўскага раёна і падчас экскурсіі атрымаць кансультацыю траўніка і паспрабаваць гарбату з зёлак. Экспазіцыя «Прырода роднага краю» знаёміць з біяразнастайнасцю раёна, з відамі раслін і жывёл, занесенымі ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь. Таксама арганізаваны інтэр-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

актыўныя гульні «Ядомае – неядомае» і «Сляды звяроў», экалагічны плакат з люстэркам, сонечны кветкавы гадзіннік, гульнёвае поле-лабірынт «Жыццё насякомага», зона для даследавання мікрасвету праз мікраскоп.

Такім чынам, на музеі, у тым ліку і літаратурна-мемарыяльныя, як інстытуты захавання і трансляцыі гістарычнай памяці, ускладаецца вялікая адказнасць па передачы асноўных фундаментальных каштоўнасных нормаў і арыенціраў. Культурна-адукацыйная дзейнасць Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа мае свае асаблівасці, звязаныя з профілем установы, і мае ўхіл на імкненне не толькі па передачы ведаў аб жыцці і творчасці Якуба Коласа, па беларускай і сусветнай літаратуры, але і далучэнні да свету нацыянальнай традыцыйнай культуры і мастацтва.


1. *Мацевасян, А. Р.* Выхаванне патрыятызму сродкамі ваенна-гістарычных музеяў / А. Р. Мацевасян // Пазашкольнае выхаванне: Штокв. навук.-метад. і інфарм. часоп. / заснав.: рэд. часоп. «Адукацыя і выхаванне». – 2008. – № 2. – С. 13–15.

2. Музееведение. Музеи исторического профиля: Учеб. пособие для вузов по спец. «История» / под ред. К. Г. Левыкина, В. Хербста. – М. : Высш. шк., 1988. – 431 с.

3. *Ратынская, Н.В.* Пісьменнікі і грамадска-палітычныя дзеячы аб беларускай мове / Н. В. Ратынская, Г. У. Мядзведзь // Актуальные проблемы обучения русскому и белорусскому языкам в медицинском вузе : (к 35-летию кафедры) : сб. науч. статей / М-во здравоохр. Респ. Беларусь, Белорус. гос. мед. ун-т, кафедра белорус. и рус. языков. – Минск, 2009. – С. 107–110.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ